# Выступленне К. Т. МАЗУРАВА—

## кіраўніка дэлегацыі Беларускай ССР на XV сесіі Генеральнай Асамблеі ААН па пытанню «Прадстаўніцтва Кітая ў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый» 6 кастрычніка 1960 г.

Пан старшыня.

Я папрасіў слова для таго, каб падтрымаць прапанову дэлегацыі Савецкага Саюза аб уключэнні ў парадак дня XV сесіі Генеральнай Асамблеі ААН пытання аб прадстаўленні Кітайскай Народнай Рэспублікі яе законнага месца ў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.

Амаль штогод у ААН прымаюцца новыя краіны. Толькі на гэтай сесіі ў яе рады ўлілося 16 новых дзяржаў. У адносінах жа да Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Генеральнай Асамблеі разыгрываецца ганебны фарс. У выніку агрэсіўнай дыскрымінацыйнай палітыкі ўрада ЗША і іх саюзнікаў па ваенных блоках, народны Кітай на працягу вось ужо 10 год пазбаўлен магчымасці прымаць удзел у рабоце Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, а ў зале пасяджэнняў на месцах законных прадстаўнікоў Кітайскай Народнай Рэспублікі сядзяць паны, якія прадстаўляюць не кітайскі народ, а толькі саміх сябе, ды амерыканскія войскі, якія акупіравалі кітайскі востраў Тайвань.

Некаторыя дэлегаты, якія выступалі ў спрэчках па гэтаму пытанню, імкнучыся паказаць усю бязглуздасць і абсурднасць становішча, што стварылася, спасылаючыся на Статут і іншыя дакументы ААН, юрыдычна абгрунтоўвалі справядлівасць патрабавання аб аднаўленні правоў народнага Кітая ў ААН. Гэтыя довады вельмі пераканаўчыя. Яны сведчаць аб тым, што ў ЗША і іх саюзнікаў няма ніякіх законных падстаў для адмовы КНР у аднаўленні яе правоў у ААН. Калі б такія падставы былі, прадстаўнік ЗША, напэўна, пастараўся б іх прывесці ў сваім выступленні. Не выпадкова прадстаўнік Вялікабрытаніі зусім не аргументаваў сваю пазіцыю.

У Генеральнай Асамблеі нярэдкія выпадкі, калі пытанне ставіцца з ног на галаву. Пытанне аб правах Кітая —якраз такое пытанне. У праціўнікаў аднаўлення правоў КНР у ААН няма законных падстаў для апраўдання сваёй пазіцыі. У якасці аргументаў яны выстаўляюць паклёпніцкія выдумкі аб становішчы спраў у КНР і знешняй палітыцы яе ўрада, прад'яўляюць КНР абвінавачанні, вытрыманыя ў духу халоднай вайны. Думаю, што ўсім дэлегатам Асамблеі ясна, у чым справа. Урад ЗША, не лічачыся ні з чым, шалёна працідзейнічае допуску прадстаўнікоў КНР у ААН і па палітычных матывах. Аказвае пры гэтым грубы націск і на іншыя дзяржавы.

Злучаныя Штаты ніяк не могуць прымірыцца з тым, што народы Кітая назаўсёды пакончылі з імперыялістычным і феадальным прыгнётам і беспаваротна сталі на шлях сацыялістычнага развіцця. Іменна гэта вызначае агрэсіўную і дыскрымінацыйную палітыку ЗША ў адносінах да Кітая. ЗША баяцца голасу народнага Кітая ў ААН. Яны вельмі добра разумеюць, што народны Кітай будзе выступаць за мір, за раззбраенне, за справядлівае, мірнае вырашэнне міжнародных спрэчак, будзе працідзейнічаць агрэсіўнай палітыцы ЗША. Правячыя колы ЗША настолькі асляплены нянавісцю да камуністаў, што трацяць пачуццё рэальнасці.

Злучаныя Штаты це прызнаюць Кітайскую Народную Рэспубліку. Правячыя колы ЗША, якія адлюстроўваюць палітыку капіталістычных манаполій, наогул арганічна не могуць прымірыцца з узнікненнем новых сацыялістычных дзяржаў. ЗША, як вядома, доўгі час не прызнавалі і Савецкі Саюз. Але ад гэтага наша вялікая сацыялістычная дзяржава не перастала існаваць. Яна жыла, бурна развівалася і цяпер з'яўляецца найбольш магутнай краінай свету. Тое ж адбываецца і з народным Кітаем. Палітыка непрызнання КНР не прынясе ЗША ніякіх выгод гэтак жа, як не прынесла выгод палітыка непрызнання СССР. Аднак недапушчальна, каб ААН навязваліся рашэнні па камандзе з Вашынгтона. Гэта прыніжае аўтарытэт ААН у вачах народаў.

Удзел у нашай арганізацыі той ці іншай дзяржавы не можа і не павінен вызначацца самавольствам амерыканскага ўрада і ставіцца ў залежнасць ад таго, прызнаюць ЗША дзяржаву ці не.

Прадстаўнік ЗША, выступаючы па гэтаму пытанню, абвінавачваў КНР у агрэсіўнасці. Але гэта брудны паклёп. Усяму свету вядома, што не КНР захапіла амерыканскія тэрыторыі, а наадварот. ЗША незаконна акупіруюць астравы, якія належаць кітайскаму народу; не КНР пагражае ЗША, а ваенныя базы і флот ЗША ў агрэсіўных мэтах знаходзяцца ля берагоў Кітая за 10 тысяч кіламетраў ад амерыканскага кантынента. Не кітайцы, а амерыканская ваеншчына арганізуе правакацыі супраць КНР. Ваенныя караблі і самалёты ЗША сістэматычна ўрываюцца ў тэрытарыяльныя воды і паветраную прастору народнага Кітая. За два апошнія гады ўзброеныя сілы ЗША больш чым 150 разоў парушалі суверэнітэт Кітая. Хіба гэта не самавольства? Хіба можна мірыцца з такой беззаконнасцю ў міжнародных адносінах?

Прадстаўнік ЗША, выступаючы тут, абвінавачваў КНР у парушэнні правоў чалавека, у адсутнасці ў КНР свабоды асобы. Кіраўнік савецкай дэлегацыі М. С. Хрушчоў даў у сваёй прамове дастойную водпаведзь амерыканскаму прадстаўніку, паказаў, чаго варты правы чалавека ў ЗША, у гэтай «узорнай» краіне так званага свабоднага свету. Так, у КНР няма некаторых «свабод», якія ёсць у дастатку ў ЗША. Я маю на ўвазе, напрыклад, працвітаючую ў ЗША свабоду для капіталістычных манаполій эксплуатаваць працоўных і прысвойваць вынікі іх працы. Не ў КНР, а іменна ў ЗША шырока распаўсюджана такая ганебная і зусім недапушчальная ў наш час з'ява, як расавая дыскрымінацыя ў яе найбольш агідных формах. Жорсткай расавай дыскрымінацыі падвяргаюцца ў ЗША мільёны людзей, якія маюць іншы, нябелы колер скуры. Хто не ведае аб трагічным лёсе карэннага насельніцтва ЗША—індзейцаў. Яны выміраюць таму, што з'яўляюцца жорстка прыгнятаемым каланіяльным народам. Сярэдняя працягласць жыцця індзейцаў ЗША ў 3—4 разы карацей, чым у цэлым па краіне. У ЗША да гэтага часу лінчуюць неграў. Мільёны неграў пазбаўляюцца выбарчых правоў. На мінулых прэзідэнцкіх выбарах з 5 мільёнаў неграў, што жывуць у паўднёвых штатах, маючых права голасу, былі зарэгістраваны ў якасці выбаршчыкаў менш чым 25 працэнтаў.

Тры мільёны негрыцянскіх дзяцей у гэтай краіне не могуць вучыцца разам з дзецьмі белых і вымушаны наведваць негрыцянскія школы, арганізаваныя па прынцыпу сегрэгацыі. Ці не гэтыя «магчымасці» для ўсіх амерыканцаў меў на ўвазе пан Уодсвард?

У ЗША працвітае макартызм, працягваецца «паляванне на ведзьмаў». Ахвярамі гэтых ганебных з'яў становяцца многія сумленныя амерыканцы, асабліва, калі яны да таго ж негры. Хіба не аб гэтым сведчыць лёс вельмі таленавітага негрыцянскага спевака і акцёра, вядомага барацьбіта за мір Поля Робсана. Яго голас, які ведаюць і любяць ва ўсім свеце, не мог свабодна гучаць у тэатрах і канцэртных залах Злучаных Штатаў, і ён пакінуў сваю радзіму.

Прадстаўнік ЗША ўзводзіў тут паклёп на КНР, сцвярджаючы, што ўрад народнага Кітая нібыта праводзіць агрэсіўную палітыку. Але гэтая спроба ачарніць КНР яўна не ўдалася.

Разам з іншымі сацыялістычнымі краінамі КНР праводзіць мірную знешнюю палітыку. Урад КНР падтрымлівае прапанову СССР аб усеагульным і поўным раззбраенні і гатоў канструктыўна ўдзельнічаць у перагаворах па гэтаму пытанню. Нядаўна ўрад КНР выступіў ініцыятарам заключэння пакта міру паміж краінамі Азіі і Ціхага акіяна і ператварэння гэтага раёна ў бязатамную зону. І паказальным з'яўляецца той факт, што ЗША, якія абвінавачваюць КНР у агрэсіі, адмовіліся нават абмеркаваць гэтую прапанову.

Кітайская Народная Рэспубліка развівае дружалюбныя адносіны з усімі краінамі. Яе знешняя палітыка заснавана на прынцыпах мірнага суіснавання, выпрацаваных Бандунгскай канферэнцыяй краін Азіі і Афрыкі. Толькі гэтымі днямі стала вядома аб тым, што паміж КНР і Бірмай падпісана пагадненне аб урэгуляванні пагранічных пытанняў.

Кітайскі народ, які моцна стаў на шлях будаўніцтва сацыялізма, мае вялікія поспехі ў эканамічнай, сацыяльнай і культурнай галінах. За кароткі гістарычны тэрмін у жыцці Кітая адбыліся карэнныя змены. Народны Кітай на справе паказвае, як адсталая, слабаразвітая краіна, дзе ва ўладзе знаходзяцца працоўныя, можа за найкарацейшыя тэрміны ўвайсці ў лік перадавых прамыслова развітых дзяржаў свету. Народная ўлада абудзіла і накіравала па правільным шляху энергію сотень мільёнаў раней прыгнечаных людзей. Стаўшы свабоднымі тварцамі свайго жыцця, гэтыя людзі літаральна робяць цуды.

Кітайскі народ у 1959 годзе—на тры гады раней тэрміну—выканаў асноўныя паказчыкі другога пяцігадовага плана на 1958—1962 гг. Народная гаспадарка КНР развіваецца небывала высокімі тэмпамі. Па аб'ёмах вытворчасці КНР выходзіць у лік перадавых краін свету. Дастаткова сказаць, што ў 1960 годзе па вытворчасці сталі КНР зойме пятае месца ў свеце.

На аснове паспяховага развіцця эканомікі няўхільна павышаецца матэрыяльны і культурны ўзровень кітайскага народа.

Безразважная палітыка, праводзімая ў адносінах да КНР правячымі коламі ЗША і некаторых іншых краін Захаду, асуджаецца ўсім прагрэсіўным чалавецтвам. Без народнага Кітая нельга забяспечыць сапраўднае супрацоўніцтва паміж народамі. Без народнага Кітая нельга забяспечыць трывалы і ўстойлівы мір ва ўсім свеце. Без удзелу народнага Кітая нельга эфектыўна вырашыць пытанне аб усеагульным і поўным раззбраенні—гэтую надзённую праблему сучаснасці.

Адсутнасць законных прадстаўнікоў Кітая ў ААН наносіць шкоду самой Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, як гэта ўжо адзначаў М. С. Хрушчоў. Нельга далей дапускаць абуральчага парушэння прынцыпаў універсальнасці, на якіх заснавана наша арганізацыя. Аднаўленне законных правоў КНР у ААН у велізарнай ступені ўзняло б прэстыж і аўтарытэт ААН, унесла б вялікі ўклад у справу аздараўлення міжнароднай абстаноўкі і садзейнічала б больш паспяховаму выкананню задач, якія стаяць перад нашай арганізацыяй.

Пазіцыя Беларускай ССР па пытанню аб прадстаўніцтве КНР у ААН з'яўляецца нязменнай. Мы заўсёды выступалі за аднаўленне правоў, якія належаць Кітайскай Народнай Рэспубліцы ў ААН, і будзем дабівацца, каб справядлівасць перамагла.

Толькі ўрад Кітайскай Народнай Рэспублікі мае права прадстаўляць Кітай у міжнародных арганізацыях. Толькі прадстаўнікі, назначаныя гэтым урадам, могуць прадстаўляць вялікую кітайскую дзяржаву ў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, і, вядома, не можа быць і гутаркі аб «двух Кітаях». Вось чаму дэлегацыя Беларускай ССР падтрымлівае адпаведную папраўку дэлегацыі Непала, у якой прапануецца прыняць прапанову ўрада СССР аб уключэнні ў парадак дня пытання «Прадстаўніцтва Кітая ў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый». Мы таксама падтрымліваем папраўку дэлегацыі Гвінейскай Рэспублікі аб тым, каб выключыць з ААН прадстаўніка Чан Кай-шы і запрасіць прадстаўнікоў урада Кітайскай Народнай Рэспублікі заняць свае законнае месца ў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый і яе органах.

Мы лічым, што вялікія мэты барацьбы за мір і міжнародную бяспеку, жыццёвыя інтарэсы ўсяго чалавецтва патрабуюць станоўчага вырашэння пытання аб прадстаўніцтве народнага Кітая ў ААН.

Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь